Бялыніцкая ДАЎНІНА

Краязнаўчы альманах
(дадатак да газеты «Паходня»)

№ 5 (21)
Ліпень
2008 г.

# Устанаўленне савецкай улады на тэрыторыі Бялыніцкага раёна

Пасля кастрычніцкіх падзей 1917 г. у Петраградзе пачалося ўстанаўленне савецкай улады ў многіх кутках былой імперыі. На тэрыторыі Бялыніцкай і Нежкаўскай валасцей гэты працэс меў складанасці, таму што ў Магілёве знаходзілася Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага, дзе рэвалюцыя была ўспрынята адмоўна. Перашкаджалі ўстанаўленню новай улады члены мясцовых арганізацый "Бунда", "Саюза рускага народа". Тым не менш у лістападзе 1917 г. у Бялыніцкай, Нежкаўскай, Царковішчанскай валасцях стварэннем валасных сялянскіх Саветаў завяршылася работа па арганізацыі савецкай улады.

16 – 18 снежня 1917 г. адбыўся першы з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Магілёўскай губерні. Але, паколькі на з'ездзе не былі прадстаўлены многія Саветы, вырашылі склікаць 5 студзеня 1918 г. агульнабеларускі 2 з'езд Саветаў.

У перыяд з 5 па 10 студзеня 1918 г. адбыліся 3 з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў і 4 з'езд сялянскіх дэпутатаў Магілёўскай губерні. 4 губернскі з'езд сялянскіх дэпутатаў падтрымаў савецкую ўладу, заклікаў на яе абарону ўсіх працоўных, прызнаў неабходным неадкладна прыступіць да ўзбраення сялянства і разбраення буржуазіі і прыняў рашэнне аб стварэнні Чырвонай гвардзіі.

З'езд выказаўся за правядзенне зямельнай рэформы на наступных падставах: адмене права ўласнасці на зямлю, якая з усімі недрамі павінна стаць усенародным здабыткам і давацца працоўным на правах землекарыстання. Размеркаванне зямлі збіраліся праводзіць ураўняльна паводле працоўнай, спажывецкай вытворчай нормы, зямлёй павінен быў карыстацца той, хто яе апрацоўвае. Ажыццяўляць распараджэнне зямлёй мусілі губернскі і павятовы зямельныя камітэты. У першую чаргу зямлёй надзяляліся беззямельныя і малазямельныя.

Выконваючы рашэнні 4 з'езда сялянскіх дэпутатаў, валасныя сялянскія Саветы пачалі разгортваць работу па ўмацаванню новай улады. У Галоўчыне Нежкаўскай валасці бальшавік Л. Дракін арганізаваў чырвонагвардзейскі атрад, які потым зліўся з першым чырвонаармейскім палком, арганізаваным у Магілёве. У вёсцы Замачулле Царковішчанскай воласці сяляне ў снежні 1917 г. абяззброілі атрад кавалерыстаў – працiўнікаў савецкай улады і пад аховай адправілі ў Магілёў.

***Анатоль Марозаў***

# У якім годзе быў створаны Бялыніцкі раён?

Бялыніцкі раён быў утвораны ў 1924 годзе і ўвайшоў у склад Магілёўскай акругі БССР. Адбылося гэта 17 ліпеня. Размяшчаўся раён на плошчы 1430 кв. вёрст, дзе пражывала 48396 чалавек. Раён налічваў 17 сельсаветаў з 629 населенымі пунктамі. Па перапісу наступнага, 1925 года, у раёне мелася 378 рамесніцка – саматужных прадпрыемстваў, на якіх працавалі каля 130 рабочых. Лясоў у раёне было 22 тыс. дзесяцін, якія абслугоўваліся 6 лясніцтвамі. У мястэчках і вёсках налічвалася 62 школы, у тым ліку сямігодка і школа рабочай моладзі. Тым не менш 52 працэнты насельніцтва былі непісьменныя.

Сетка лячэбных устаноў складалася з райбальніцы, участковага ўрачэбнага пункта, 2 ФАПаў і аднаго ўрачэбнага пункта. У пяці спажыўтаварыствах – Бялыніцкім, Галоўчынскім, Высоцкім, Ігліцка – Студзенкаўскім і Эсьмонскім – аб'ядноўвалася каля 1000 пайшчыкаў.

***«Згукі мінуўшчыны»***

**Мы вернем стужку, што з вякоў**
**Яднае нас на шлях прарочы**
**І зноў сагрэе землякоў**
**Святое ззянне Белай Ночы.**

***Святлана Войлакава***

## Візіты

# У дзень 300-годдзя Галоўчынскай бітвы вёску Галоўчын наведалі шведы

4 ліпеня вёску Галоўчын Бялыніцкага раёна наведала група грамадзян Каралеўства Швецыя ў складзе трох чалавек. Групу ўзначальваў спадар Бу, усе замежныя госці з'яўляліся навуковымі супрацоўнікамі інстытута ваеннай гістарыі Швецыі. Грамадзяне Швецыі прыехалі ў Беларусь з адмысловай мэтай – наведаць месца бітвы пад Галоўчынам, пабачыць і сфатаграваць мясціны, дзе адбывалася гэта гістарычная падзея. Нагадаю, што 4 ліпеня 1708 года ў Галоўчынскай бітве шведскае войска пад кіраўніцтвам караля Карла 12 (як лічаць шведы) атрымала сваю апошнюю буйную перамогу над рускім войскам пад час Паўночнай вайны 1700 – 1721 гг.

У Галоўчыне гасцей са Швецыі сустрэў стараста вёскі Галоўчын, вядомы бялыніцкі краязнаўца Васіль Емельянавіч Цыркуноў. Ён жа паказаў замежным гасцям усе памятныя месцы, дзе разгортваліся асноўныя падзеі Галоўчынскай бітвы і якія шведскія навукоўцы ведалі толькі па гістарычным дакументам. Дарэчы, як паведамілі шведы, у 1911 годзе мястэчка Галоўчын ужо наведвалі два шведскіх афіцэры, якія тады зрабілі шмат фотаздымкаў і схем на месцы былой бітвы. Копіі гэтых матэрыялаў і старых здымкаў мястэчка Галоўчын, а таксама шмат іншых гістарычных дакументаў, якія распавядаюць аб Галоўчынскай бітве, навукоўцы са Швецыі падаравалі Васілю Цыркунову.

Напрыканцы шведскія госці ўсклалі кветкі ля памятнага знака, устаноўленага на месцы асноўных падзей бітвы каля вёскі Старое Сяло па ініцыятыве мясцовых краязнаўцаў, а таксама пакінулі за помнікам невялікі сцяг Каралеўства Швецыя. Дарэчы, памятны знак да гэтай пары афіцыйна неадчынены, бо бялыніцкія ідэалагічныя работнікі забаранілі запланаванае на 2 ліпеня афіцыйнае адкрыццё цалкам падрыхтаванага помніка, як быццам бы таму, што ў гэтай бітве расійскае войска атрымала паразу. Зараз афіцыйна адкрыць памятны знак плануецца 5 верасня. Што крамольнага знайшлі чыноўнікі ў помніку, надпіс на якім гучыць наступным чынам: **"Здесь 4 июля 1708 года произошла битва между российскими и шведскими войсками. Вечная память воинам, погибшим в этой битве",** ніхто з мясцовых жыхароў зразумець няможа, тым больш, што абодва гэтыя войскі былі для беларусаў чужымі, бо пад час Галоўчынскай бітвы Беларусь уваходзіла ў склад іншай дзяржавы – Рэчы Паспалітай.

Грамадзяне Швецыі былі вельмі ўсцешаны адбыўшайся паездкай і выказалі жыхарам Галоўчына вялікую падзяку за ўстаноўку памятнага знака.

***Барыс Вырвіч***

## Асобы нашай гісторыі

# Архімандрыт Алімпій

Святар і мастак Алімпій (Аляксей Рыгоравіч Кабанаў) служыў з 1900 да 1907 года настаяцелем Бялыніцкага Раства-багародзіцкага манастыра. За гэты час архімандрыт Алімпій напісаў шэраг ікон: святога Георгія Пераможцы, свяціцеляў Мітрафана, Ціхана, Арсенія і іншых, зрабіў копію са славутага абраза Бялыніцкай Маці Боскай. Характэрна, што Аляксей Рыгоравіч у аднолькавай ступені выдатна валодаў як пэндзлем, так і майстэрствам фрэскавага жывапісу. Нарадзіўся ён у Арлоўскай губерні, паходзіў з сялянскай сям'і. Першапачатковую адукацыю атрымаў у бацькавай хаце.У 1907 г. пераведзены на пасаду настаяцеля Цюменскага Свята-Троецкага манастыра Табольскай губерні.

***«Згукі мінуўшчыны»***

## Рэлігія Бялыніцкага раёна

**На тэрыторыі раёна дзейнічаюць 9 рэлігійных абшчын, з іх – 3 прваслаўных, 1 – каталічаская, 3 – евангельскіх хрысціян-баптыстаў, 2 – хрысціянаў веры евангельскай.**
**У 2004 годдзе пабудавана новая царква.**

www.nn.by - інтэрнэт-сайт газеты «Наша ніва»

# БЯЛЫНІЦКІ АБРАЗ МАЦІ БОЖАЙ

Бялынічы калісьці называлі «беларускім Чэнстаховам». Абраз Маці Божай, які знаходзіўся ў тутэйшым касцёле кармэлітаў, у XVIII–XIX стст. збіраў пілігрымаў усіх хрысціянскіх канфесій з далёкіх ваколіцаў. У 1761 г. ён быў урачыста ўкаранаваны асвячонымі ў Рыме каронамі, а напярэдадні падзеі выйшла кніжка з апісаннем гісторыі абраза. Адразу пасля заснавання канцлерам Львом Сапегам кляштара кармэлітаў у Бялынічах (1624 г.) манахі беспаспяхова стараліся набыць для свайго храма абраз Маці Божай, аднак у тым глухім краі на той час добрага мастака знайсці было цяжка. І вось аднойчы прыйшоў да брамы кляштара малады пілігрым, які паабяцаў прыёру намаляваць абраз Найсвяцейшай Маці Божай і сказаў, каб манахі спявалі літанію ў той час, калі ён будзе працаваць. Яшчэ не скончылася літанія, а мастак, намаляваўшы толькі прыгожыя твары Маці Божай і Пана Езуса, сказаў манахам, што Маці Божая сама сябе аздобіць у наступным годзе, і на вачах усіх дзіўным чынам знік. Толькі тады манахі здагадаліся, што гэта быў не просты мастак, а пасланец неба. Адбылося гэта ў 1634 г., а ў 1635 г. маршалак Вялікага Княства Літоўскага Крыштаф Завіша аздобіў абраз каштоўнай шатай, ахвяраваў вечную лампаду да яго і розныя воты. Затым абраз і алтар узбагаціў падканцлер Казімір Леў Сапега.

Жэгота Паулі ў 1-й палове XIX ст. напісаў, што старадаўні абраз Багародзіцы падараваны праз Льва Сапегу бялыніцкім кармэлітам у 1623 г. манахамі Куцеінскага манастыра. У пачатку XX ст., калі кляштар ужо быў праваслаўным, царкоўныя гісторыкі сцвярджалі, што абраз з'явіўся ў Бялынічах у XVI ст., і само заснаванне тут кармэлітаў было знакам яго шанавання, аднак гэтая версія яшчэ меней абаснаваная гістарычнымі дакументамі, чым паданне пра мастака-анёла. Не вытрымлівае гістарычнай крытыкі легенда пра тое, нібы абраз у XIII ст. быў прынесены ў Бялынічы ў Іллінскую царкву манахамі з Кіева-Пячэрскай лаўры, а ў кармэліцкі кляштар трапіў пасля Брэсцкай уніі. Няма ніякіх сведчанняў пра існаванне ў XIII ст. Бялынічаў як паселішча, а тым болей няма згадак пра Іллінскую царкву. У апошні час гісторыя бялыніцкай іконы расквечана проста фантастыкай: яна нібыта была вядома ў Кракаве раней за X ст., што сведчыць пра далёкае праваслаўнае мінулае Польшчы, а пазней натхніла Францішка Скарыну на выданне Біблії.

У 1660 г., калі ўзнікла ваенная пагроза, законнікі вырашылі адвезці абраз з усім срэбрам і касцёльным начыннем у Кракаў. Аднак Бог у бясконцай сваёй дабрані, відаць, не захацеў, каб гэты абраз з Літоўскага краю быў аддалены. Ён зрабіў так, што калі законнікі з абразам праязджалі міма Ляхавіцкай фартэцыі, яны былі затрыманы невядомай сілай і коні ніяк не маглі пайсці далей. Вестка пра гэты цуд дайшла да Станіслава Міхала Юдзіцкага, генерала каманды ў Ляхавіцкай фартэцыі, які, выйшаўшы з духавенствам, прыняў абраз і праводзіў яго да фартэцыі. Два законнікі засталіся пры абразе для яго



аховы, а астатнія з касцёльным срэбрам паехалі ў Кракаў.

Неўзабаве вялікая маскоўская сіла аблажыла Ляхавіцкі замак і з 23 сакавіка да 20 чэрвеня штурмавала яго, ды яшчэ прыйшоў са значным войскам Хаванскі, які насміхаўся і казаў: «Як гэта той каробкі не здабыць!» Але вялікі жаўнер і добры слуга Маці Божай Юдзіцкі натхняў рыцарства да мужнага бою, а духавенства і насельніцтва заклікаў, каб дні і ночы прасілі Маці Божую аб дапамозе. І былі пачуты малітвы, бо сама Найсвяцейшая Панна паказалася, страшэнна напалохаўшы непрыяцеляў, і дадавала слабым сілам абаронцаў сваю сілу. Нарэшце Хаванскі, страціўшы мноства воінаў, адышоў з сорамам і праз тыдзень быў разгромлены пад Палонкай Стэфанам Чарнецкім і Паўлам Сапегам.

Сучаснікі пісалі: «Як у Польшчы ад шведаў Чэнстахоўскім абразом фартэцыя была абаронена, так у Літве Ляхавіцкая ад маскоўскай аблогі была вызваленая».

***(Працяг на ст. 4)***

# БЯЛЫНІЦКІ АБРАЗ МАЦІ БОЖАЙ

Станіслаў Юдзіцкі ахвяраваў абразу вотум-табліцу са срэбра з алавянай куляю, якой быў паранены пад Вільняю. На табліцы была наштыхавана выява Маці Божай над Ляхавіцкай фартэцыяй з надпісам вакол галавы «Obrona Lachowicka, pocz№tek wojen wygranych», а над фартэцыяй напісаны ўдзячны верш.

У 1-й палове XVIII ст. зафіксаваны цудоўныя вылячэнні і выратаванні пры заступніцтве бялыніцкага абраза Маці Божай, але існуюць супярэчлівыя звесткі пра тое, дзе ён у гэты час знаходзіўся. Вядомы гісторык марыяграфіі В. Навакоўскі сцвярджаў, што кармэліты вярнулі абраз у Бялынічы пры дапамозе Тэафілі Сапежыны з Ябланоўскіх, жонкі крайчага літоўскага Юзафа Сапегі, толькі ў 1760 г., калі ўжо ішла падрыхтоўка да каранацыі. Аднак гэтае меркаванне памылковае ўжо хоць бы таму, што Сапега ажаніўся з Ябланоўскай толькі ў 1761 г. Да таго ж, нелагічнымі выглядаюць захады аб каранацыі ў Бялынічах абраза, які знаходзіцца ў Ляхавічах ці ў іншым месцы.

Вядомы касцёльны гісторык і архівіст Я. М. Гіжыцкі (Валыняк), хоць і падае дату вяртання абраза 1760 годам, аднак выказвае наконт яе сумненне, спасылаючыся на дакумент з архіва львоўскіх кармэлітаў аб верыфікацыі цудатворнасці абраза перад яго каранацыяй. Маршалак ВКЛ Ігнацы Агінскі, пісар ВКЛ Антоні Пац і прыёр бялыніцкага кляштара Казімір Радзінскі звярнуліся да біскупа віленскага Міхала Яна Зянковіча з просьбай апрабаваць цуды Маці Божай Бялыніцкай. 27 лістапада 1755 г. камісія ў складзе обалецкага пробашча архідыякана беларускага Яна Шумскага і дзекана бабруйскага Юзафа Крычскага прыехала ў Бялынічы, каб заслухаць пад прысягай аповеды сведак і вывучыць кнігу запісаў цудаў абраза. Запісанымі ў кнізе аказаліся 16 выпадкаў вылячэнняў, пачынаючы з 1706 г. Такім чынам, ва ўсякім разе ў пачатку XVIII ст., абраз ужо знаходзіўся ў Бялынічах. Біскупская камісія агледзела таксама нейкія карціны («візарункі») з падпісанымі ілюстрацыямі цудатворных эпізодаў. На жаль, гэтыя карціны да нас не дайшлі, але іх змест пададзены Я. М. Гіжыцкім, напэўна, паводле львоўскага рукапісу. З подпісаў на карцінах вынікае, што ўжо ў 1671 г. абраз знаходзіўся ў Бялынічах, якія тады разам з Магілёвам і Шкловам належалі да Аршанскага павета. Пазнейшыя дакументы XIX ст. пра бялыніцкую ікону з архіва Магілеўскай архідыяцэзіі паведамляюць, што абраз быў вывезены ў Ляхавічы ў 1660 г., а прывезены назад у 1665 г. пры пасярэдніцтве літоўскага крайчага Паўла Сапегі з жонкай.6 Магчыма, тут маецца на ўвазе Бэнэдыкт Павел, крайчы ў 1670 г. і староста аршанскі ў 1675–1676 гг.

Паводле высноваў камісіі, біскуп прызнаў абраз цудатворным, і неўзабаве Папа Рымскі дазволіў яго каранаваць. Урачыстасць адбылася ў новым, мураваным, касцёле Унебаўзяцця Багародзіцы 8 верасня 1761 г. Ініцыятарамі і фундатарамі ўрачыстасці былі Ігнат, Тадэвуш і Алена Агінскія, а таксама Радзівілы. Прайшла яна надзвычай пышна. У Бялынічы ішлі працэсіі трынітараў з Віцебска, дамініканцаў з Оршы, кармэлітаў з Мсціслава. Для салютавання прывезлі 30 гарматаў «з Літвы» і Быхава.7 У далейшым дзень каранацыі (8 верасня, свята Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі) стаў у Бялынічах найвялікшым фэстам нараўне з патранальным святам закону кармэлітаў — Маці Божай Шкаплернай (16 ліпеня).

У новым касцёле абраз знаходзіўся над галоўным алтаром у нішы, да якой вялі мураваныя сходы (верагодна, накшталт капліцы ў віленскай Вострай Браме). Працытуем адно з апісанняў: «...Вялікімі цудамі слынны абраз намаляваны на дрэве цудоўна. Шата сярэбраная пазалочаная ў раме сніцарскай работы пазалочанай. Карона абраза з чыстага золата з markмі камянямі, таксама і ў Пана Езуса...Уверсе над абразом сярэбраная карона пазалочаная і два анёлкі пры ёй...».

Дапамогі ў абраза шукалі людзі markнага стану: у пераліку вотаў пач. XIX ст. сустракаюцца залатыя пярсцёнкі з брыльянтамі і іншымі каштоўнымі камянямі і ордэнскія знакі. Падобна на тое, што абраз і воты не пацярпелі нават у час вайны 1812 года.

***Аляксандр Ярашэвіч***

***(заканчэнне ў наст. №)***

Бялыніцкая
Краязнаўчы альманах (дадатак да газеты «Паходня»)
ДАЎНІНА
Кразнаўчы альманах (дадатак да газеты «Паходня»).Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна
Бялыніцкі раён, в. В.Машчаніца. тэл. 37-110. Рэдактар Вырвіч Б.І. Наклад. 299 асобнікаў